© Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа № 1/2025

***Зубік З. І.**, настаўніца пачатковых класаў Крывошынскай сярэдняй школы імя Г. С. Здановіча Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці*

# Паўзуны (рэптыліі)

## Чалавек і свет. II клас

**1. Абвядзіце літары, якімі пазначаныя правільныя адказы.**

Земнаводныя — гэта жывёлы:

а) якія жывуць у вадзе і на сушы;

б) цела якіх пакрытае лускавінкамі;

в) цела пакрытае голай вільготнай скурай.

**2. Злучыце стрэлкамі назвы жывёл і іх апісанні.**

| | |
|---|---|
| рапуха | цела зеленаватага колеру з цёмнымі плямамі і светлай паласой, скура гладкая, магутныя заднія канечнасці, падобныя на ласты |
| жаба азёрная | канечнасці даволі кароткія і слабыя, па сушы перамяшчаецца павольна, выгінаючыся доўгім гнуткім целам |
| трытон | цела зеленавата-шэрага колеру, заднія ногі кароткія і слабыя. |

**3. Аднавіце харчовыя ланцугі.**

Капуста — ____________________________ — рапуха.

Расліна — ____________________________ — жаба.

**Праца з карткамі.**

1-шы вучань. Беларусі спрытная яшчарка сустракаецца на ўсёй тэрыторыі. Насяляе звычайна адкрытыя ўчасткі, якія добра праграваюцца.

Сваю назву атрымала за хуткія і рэзкія, імпульсіўныя рухі. Мае ярка-зялёны, жаўтавата-карычневы колер, па жываце звычайна выступаюць цёмныя плямы і крапінкі. Вялікую частку светлавога часу сутак занятая здабычай корму.

Сілкуюцца жвавыя яшчаркі рознымі насякомымі. Зімуюць яшчаркі ў сваіх норах, уваходы ў якія зачыняюць лісцем, зямлёй, а таксама пад каранямі дрэў, у лясной подсцілцы, напаўгнілых пнях, драўніне.

Жвавая яшчарка з’яўляецца кормам для некаторых відаў птушак і млекакормячых. Яна з’яўляецца самым шматлікім відам рэптылій.

---

2-гі вучань. **Чарапаха балотная** жыве на Палессі, але сустрэць яе можна ў кожным раёне краіны. Больш за ўсё гэтых чарапах каля Пружанаў, Белаазёрска, Целяханаў, Добруша. Маюць цёмна-аліўкавую афарбоўку з дробнымі жоўтымі кропкамі.

Вясной балотная чарапаха з’яўляецца пасля працяглай зімоўкі. Яна закопваецца ў глей у кастрычніку-лістападзе і можа спаць так 4–6 месяцаў.

Яна добра плавае і нырае, можа доўга заставацца пад вадой. На паверхню падымаецца праз кожныя 15–20 хвілін, каб глынуць паветра. Сілкуецца жукамі, чарвякамі, макрыцай, малюскамі.

3-гі вучань. **Змеі** жывуць усюды, у тым ліку каля вадаёмаў. Цела іх пакрытае рагавымі лускавінкамі. Змеі не маюць канечнасцей. Яны слізгаюць па паверхні зямлі, хвалепадобна выгінаючы цела. Поўзаюць па паверхні зямлі, таму іх называюць паўзунамі.

Размнажаюцца змеі толькі на сушы. З адкладзеных яек з’яўляюцца маленькія змеі, падобныя да дарослых.

Змеі палююць на жаб, яшчарак, насякомых, мышэй, дробных птушак. Гадзюкі сваю здабычу забіваюць ядам, які выдзяляецца з зубоў. А мядзянкі душаць кольцамі свайго цела. Гэтая змяя занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

**1. Праца з табліцай.**

Варыянт 1 апісвае вужа і яшчарку,

варыянт 2 — чарапаху і гадзюку. Пасля запаўнення табліцы звяраюць адказы на слайдзе.

| **Прыметы для параўнання** | **Паўзуны** | |
|---|---|---|
| | **Вуж** | **Яшчарка** |
| Афарбоўка (характэрныя асаблівасці) | | |
| Дзе жыве? | | |
| Чым корміцца? | | |
| Небяспека для чалавека | | |

| **Прыметы для параўнання** | **Паўзуны** | |
|---|---|---|
| | **Гадзюка** | **Чарапаха** |
| Афарбоўка (характэрныя асаблівасці) | | |
| Дзе жыве? | | |
| Чым корміцца? | | |
| Небяспека для чалавека | | |